***А. М. Ермакова***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# СПЕЦКУРС "ДЫСКУРСІЎНЫ АНАЛІЗ ТЭКСТУ" Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ ФІЛОЛАГАЎ

Дысцыпліна, якая вывучае дыскурс, атрымала назву дыскурсіўны аналіз. Гэты тэрмін шырокае распаўсюджанне атрымаў з 1980-х гг. Мы разумеем дыскурсіўны аналіз як узроўневы раздзел лінгвістыкі, які ўваходзіць у шэраг «фаналогія – марфалогія – сінтаксіс – дыскурсіўны аналіз». Раздзелы лінгвістыкі ў гэтым шэрагу ўпарадкаваны па памерах моўных складнікаў. У той жа час варта адзначыць, што дыскурсіўным аналізам займаюцца не толькі лінгвісты, але і прадстаўнікі іншых навук – псіхолагі, сацыёлагі, антраполагі, юрысты, псіхатэрапеўты. Такая сталая дысцыпліна, як літаратуразнаўства, з'яўляецца падраздзелам дыскурсіўнага аналізу, паколькі вывучае адзін з прыватных відаў дыскурсу, а менавіта мастацкую літаратуру.

Спецкурс «Дыскурсіўны аналіз тэксту» мае на мэце пазнаёміць магістрантаў з базавымі тэарэтычнымі звесткамі і сучаснымі распрацоўкамі ў галіне дыскурс-аналізу; даць уяўленне аб асаблівасцях функцыянавання моўных адзінак розных узроўняў у працэсе маўлення і стварэння пісьмовага тэксту, аб паняцці дыскурсу, аб тым, якія існуюць падыходы да яго выкарыстання, праблематыцы дыскурсіўнага аналізу, яго гісторыі, асноўных школах і аб кірунках, а таксама месцы ў сучасных гуманітарных ведах.

Задачы дысцыпліны:

1) вызначыць паняцце *дыскурс* і месца дыскурс-аналізу ў коле лінгвістычных дысцыплін;

2) ахарактарызаваць асноўныя напрамкі і школы сучаснага дыскурс-аналізу;

3) сфарміраваць уяўленне пра механізмы ўспрымання тэксту і рэсурсах розных моўных узроўняў у аспекце ўздзеяння на інтэлектуальную і фізічную дзейнасць адрасата;

4) сфарміраваць уяўленне пра макра- і мікраструктуру дыскурсу, заканамернасці яго стварэння і разумення;

5) сфарміраваць навыкі аналізу функцыянавання моўных адзінак розных узроўняў (ад прасадычных да тэкставых) у дыскурсе;

6) навучыць метадам аналізу PR-тэксту з пункту гледжання механізмаў уздзеяння.

Месца дысцыпліны ў сістэме вышэйшай прафесійнай адукацыі – у курсе «Дыскурсіўны аналіз тэксту» абагульняюцца, паглыбляюцца,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сінтэзуюцца веды і ўяўленні аб функцыянаванні моўных адзінак, атрыманыя ў рамках курсаў “Сучасная беларуская мова”, “Агульнае мовазнаўства”, “Лінгвістычны аналіз тэксту” і інш. Дадзены курс звязаны і з праблематыкай дысцыплін цыкла “Рыторыка”, “Маўленчае ўздзеянне”, у рамках якіх разглядаюцца механізмы моўнага ўздзеяння. Дыскурс- аналіз цесна звязаны і з такімі дысцыплінамі, як “Стылістыка і літаратурнае рэдагаванне”, “Сучаснае дзелавое маўленне”.

Курс прадугледжвае правядзенне лекцыйных і семінарскіх заняткаў, канспектаванне літаратуры і выкананне індывідуальных заданняў для засваення тэарэтычных ведаў і выпрацоўкі практычных навыкаў.

Патрабаванні да ўзроўню засваення зместу курса – магістранты знаёмяцца з тэорыяй і метадалогіяй дыскурс-аналізу, набываюць навыкі аналізу і супастаўлення падыходаў і аспектаў вывучэння дыскурсу. Магістранты павінны засвоіць сістэму тэрмінаў, ведаць асноўныя этапы станаўлення тэорыі і практыкі дыскурсіўнага аналізу.

Дадзеная дысцыпліна адыгрывае важную ролю ў прафесійнай падрыхтоўцы, паколькі разуменне механізмаў маўленчага ўздзеяння і навыкі дыскурс-аналізу з'яўляюцца важнымі складнікамі кваліфікацыі спецыяліста-філолага.

Магістранту неабходна ведаць: катэгарыяльна-паняційны апарат; сучасныя даследаванні дыскурсу; кагнітыўныя падыходы да аналізу дыскурсу; рэсурсы сістэмы мовы і яе розных узроўняў для моўнага ўздзеяння; кагнітыўную тэорыю метафары і яе ролю ў апісанні дыскурсу.

Магістрант павінен умець: самастойна аналізаваць тэксты розных жанраў, даваць аргументаваную ацэнку эфектыўнасці канкрэтнага тэксту; выкарыстоўваць паняційны апарат дысцыпліны, мець асабісты погляд адносна прыёмаў аргументацыі і спосабаў уздзеяння на адрасата; прымяняць атрыманыя веды падчас аналізу PR- і рэкламных тэкстаў.

У выніку асваення матэрыялу курса магістранты павінны мець уяўленне пра кагнітыўныя, прагматычныя, рытарычныя механізмы маўленчага ўздзеяння, сучасныя методыкі аналізу дыскурсу, а таксама валодаць навыкамі дыскурс-аналізу тэкстаў розных жанраў, што выкарыстойваюцца ў розных сацыяльных сферах.

Такім чынам, магістранты павінны ўсведамляць, што дыскурс ўяўляе сабой комплексны феномен, для даследавання якога неабходны адначасовы ўлік цэлага шэрагу абставін. Па-першае, дыскурс ўяўляе сабой адзінства камунікацыі і ўзнікае ў працэсе стварэння тэксту. Па-другое, дыскурс уваходзіць у іерархічны рад моўных (маўленчых) адзінак, які пачынаецца з фанемы і працягваецца марфемай, словам, словазлучэннем, сказам; цэласны дыскурс з'яўляецца найбуйнейшай і не абмежаванай па аб'ёме адзінкай. Па-трэцяе, для адэкватнага аналізу дыскурсу неабходна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пастаянна мець на ўвазе, што гэта адначасова сацыяльны і кагнітыўны феномен.

Спецкурс “Дыскурсіўная аналіз тэксту” знаёміць магістрантаў з самай маладой часткай лінгвістыкі. Далейшы прагрэс у развіцці гэтай навукі звязаны з міждысцыплінарным узаемадзеяннем лінгвістыкі з сумежнымі гуманітарнымі навукамі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ